2. Функционирование косвенной речи имеет свою специфику, заключающуюся в отсутствии бессоюзных дополнительных придаточных предложений и активном использовании определительных придаточных предложений, содержащих косвенную речь.

3. Во всех предложениях косвенная речь передает предметное содержание первичного сообщения, не комментируя его.

**Список основных источников**

1. Волкова, Л.Б. Категория пересказывательности в немецком и русском языках / Л.Б. Волкова // Русская и сопоставительная филология: состояние и перспективы : труды и материалы Междунар. науч. конф., посвященной 200-летию Казанского университета, Казань, 4–6 октября 2004 г. / Казан. ун-т ; под общ. ред. К.Р. Галиуллина. – Казань, 2004. – С. 136–137.

2. Лингвистический энциклопедический словарь / редкол.: В.Н. Ярцева (гл. ред.) [и др.]. – М. : Советская энциклопедия, 1990. – 682 с.

3. Троянская, Е.С. Практическая грамматика немецкой научной речи / Е.С. Троянская, Б.Г. Герман. – М. : Наука, 1974. – 427 с.

*The article considers general characteristics of direct and indirect speech. The use of direct and indirect speech in German economic and technological texts is analyzed. Analysis of the studied material has shown that direct speech in the material under consideration in the form of direct citation is used much more infrequently than indirect speech and has its peculiarities. Indirect speech is represented in the texts in different ways. The dominating model is represented by object clause with conjunction –dass and –ob and a connective word. There haven't been found any conjunctionless object clauses in the analyzed material. Attributive clauses with indirect speech take the second place in number. In all subordinate clauses indirect speech reproduces the primary meaning. The problem under study is of both theoretical and practical importance because object and attributive clauses are frequenly used in German texts on speciality.*

УДК 272 (450)-9

***А. Ф. Паддубская***

# САЦЫЯЛІЗМ І КАМУНІЗМ У САЦЫЯЛЬНАЙ КАТАЛІЦКАЙ ДУМЦЫ ПЕРЫЯДУ ПАНТЫФІКАТУ ПІЯ XII

***У артыкуле разглядаюцца адносіны сацыяльнай каталіцкай думкі да сацыялізму і камунізму ў часы пантыфікату Пія XII (1939—1958). Аналізуецца праблема стаўлення Папы рымскага, каталіцкіх тэолагаў і філосафаў да левых ідэалогій і партый левага кірунку (на прыкладзе Італіі). Беглы аналіз гэтых момантаў дапаможа, як падаецца, наблізіцца да разумення сацыяльнага вучэння каталіцкай царквы дадзенага перыяду.***

Праблематыка стаўлення да сацыялізму з'явілася ў каталіцкай літаратуры ў пачатку XIX ст. і ўжо тады сацыялізм разглядаўся як негатыўная з'ява. Прыкладам гэтага могуць стаць білі Пія VII і Льва XII, энцыклікі Рыгора XVI "Mirari vos" і "Singulari nos", якія сведчылі пра адмаўленне касцёлам гэтай ідэалогіі ў перакананасці, што яна – няправільны шлях развіцця грамадства.

Пэўныя змены ва ўспрыняцці сацыялізму і камунізму адбыліся ў энцыкліцы Льва XIII "Rerum novarum", дзе прапаноўвалася пазітыўная праграма па вырашэнні праблем грамадства. Праўда, пры гэтым працягвала крытыкавацца сама ідэалогія камунізму і сацыялізму.

Працягнуў ідэі Льва XIII Пій XI, які ў энцыкліцы "Quadragesimo anno" паказаў выразную розніцу паміж сацыялізмам і камунізмам, падкрэсліў "бесчалавечнасць" апошняга, а таксама яго мэтанакіраваную "варожасць да Бога і каталіцкай царквы" [1]. Яшчэ больш падрабязна ён вярнуўся да дадзенай праблематыкі ў энцыкліцы "Divini redemptoris". Энцыкліка з'яўляецца найбольш глыбокім аналізам камунізму ў сацыяльнай дактрыне каталіцкай царквы: "Сістэма, поўная памылак... [яна] супярэчыць як розуму, так і Божаму адкрыццю. Вучэнне, што падрывае грамадскі парадак, ігнаруючы яго асновы, сістэма, якая не разумее ні паходжання прыроды і мэтаў дзяржавы, ні правоў асобы, ні яе вартасці і свабоды" [2].

Пій XII прытрымліваўся ідэй сваіх папярэднікаў у пытанні стаўлення да камунізму, неаднаразова падкрэсліваючы непрыняцце каталіцкай царквой любых ідэалогій і тэорый, пабудаваных на атэізме [3], якія "імкнуцца з корнем вырваць з сэрцаў чалавечых веру" [4], бо менавіта яны з'яўляюцца "найбольш відавочнымі з усіх прылад разбурэння царквы і традыцыі Боскага адкрыцця" [5, p. 52–53]. Пантыфік больш за 150 разоў накладаў анафему на "бязбожнікаў камуністаў", якія называліся ворагамі Бога і стварэннямі пекла [6, с. 35]. Такая пазіцыя Пія XII шмат у чым вызначыла палітыку каталіцкай царквы на працягу ўсяго яго пантыфікату.

Тут трэба адзначыць, што сацыяльнае вучэнне каталіцкай царквы ўключае афіцыйныя дакументы Ватыкана (у першую чаргу папскія энцыклікі) і сачыненні царкоўных і каляцаркоўных інтэрпрэтатараў гэтых дакументаў. Але гістарычна каталіцкая сацыяльная думка ўзнікла раней за афіцыйную дактрыну царквы і аказала істотны ўплыў на фарміраванне апошняй. Таму падаецца лагічным разгледзець у дадзеным артыкуле настроі прадстаўнікоў Ватыкана ў перыяд пантыфікату Пія XII.

Адным з найбольш актыўных крытыкаў сацыялізму і камунізму з'яўляўся кардынал А. Атавіяні, які сцвярджаў: "Калі... вы выступіце на баку камуністаў, на наступны дзень вас адлучаць ад царквы" [7, p. 205]. Пагаджаўся з ім і кардынал Ё. Міндсэнці, прымас Венгрыі, які лічыў усялякія саступкі камуністам праяўленнем слабасці [8, p. 3].

Падтрымліваў гэту лінію і адзін з самых уплывовых каталіцкіх часопісаў – "Civiltà Cattolika". У серыі артыкулаў сцвярджалася, што

практычныя кантакты камуністаў і каталікоў немагчымыя з-за іх "дыяметральна супрацьлеглых адносін да класавай барацьбы" [9, с. 162–163] і "непрымальнай ідэалогіі камунізму" [10, p. 15]. Падкрэслівалася неабходнасць "усеагульнай мабілізацыі" для ўсіх каталікоў "пад адным сцягам для барацьбы з марксісцкім матэрыялізмам" [11, p. 5].

Вынікам такіх думак сталі дэкрэты 1949 г. і 1959 г. Згодна з першым, пад пагрозай адлучэння ад царквы забаранялася: 1) уваходзіць у камуністычную партыю і сімпатызаваць ёй; 2) распаўсюджваць, чытаць ці публікаваць камуністычныя кнігі, газеты, часопісы. Да тых каталікоў, якія парушалі вышэйназваныя пастановы, прымяняліся наступныя санкцыі: 1) яны лічыліся парушальнікамі асноў хрысціянскай веры і не дапускаліся да таямніц, 2) яны маглі быць адлучанымі ад царквы. Аргументавалася такая палітыка тым, што камунізм выступае супраць хрысціянства, а камуністычныя кіраўнікі «хоць на словах і кажуць, што нічога не маюць супраць рэлігіі, але на самой справе і тэарэтычна, і практычна з'яўляюцца ворагамі Бога і веры, і царквы Хрыстовай» [12, с. 265].

Дэкрэт 1959 г. працягваў, аб'ядноўваў і развіваў заявы біскупаў Балоньі, Падуі, Навары, пра тое, што падтрымка "чырвоных сіл" можа "падарваць адзінства каталікоў" [13, p. 6], "прывесці да сур'ёзных памылак і зніштальных практык" [14, p. 4] і ўвогуле быць "здзекам з сацыяльнай дактрыны касцёла і вучэння італьянскага біскупату" [15, p. 39]. Некаторыя каталіцкія філосафы пісалі пра немагчымасць сумеснага існавання каталікоў і камуністаў, бо "ілюзіі тых, хто верыць у магчымасць простага суіснавання дзвюх сістэм... з'яўляюцца небяспечнымі" [16, p. 34]. Акрамя таго, забаранялася падтрымліваць арганізацыі і партыі, якія "прапаведваюць прынцыпы, што супярэчаць каталіцызму" і "сваімі дзеяннямі садзейнічаюць сацыяльна-камуністычнаму руху" [17, с. 46–47].

Так, на сімпатыі да камунізму і сацыялізму была накладзена рашучая забарона, бо выкарыстанне пунктаў дэкрэтаў абмяжоўвала грамадска-палітычнае супрацоўніцтва з некаталікамі. У адносінах да камунізму быў адноўлены тэзіс энцыклікі "Divini redemptoris" пра яго непрымальную сутнасць, а адкрытасць на прадстаўнікоў левых сіл і супрацоўніцтва з Італьянскай сацыялістычнай партыяй (ІСД) разглядалася як "безадказная дзейнасць" [18, p. 8].

Адначасова з гэтым было бы няправільным разглядаць дадзеныя дакументы як адлюстраванне ўсіх настрояў, што панавалі ў Ватыкане. У каталіцкай царкве існавалі плыні, якія не адрозніваліся крайнім антыкамунізмам і антысацыялізмам. Яшчэ 14 і 26 чэрвеня 1947 г. у "L'Osservatore Romano" з'явіліся два вельмі важных артыкулы Дж.Д. Тора "Фатальнасць вайны" і "Шлях вайны і план Маршала". У іх крытыкаваліся варожасць шматлікіх прадстаўнікоў Святога пасаду да камунізму і сацыялізму [19, p. 2; 20, p. 4].

Падтрымліваў такую пазіцыю і рэдактар газеты “Adesso” П. Мадзалары, які лічыў, што антыкамуністычны выбар не з’яўляецца адзіным магчымым для хрысціяніна, а трактоўка прадстаўнікоў левых сіл як “ненавісных, агідных” [21, p. 33] не прывядзе да добрага. П. Мадзалары падкрэсліваў неабходнасць вядзення дыялогу з прадстаўнікамі левых сіл, адкінуўшы зневажанні, якія не дадаюць маральнага ўзвышэння нікому [22, p. 199].

Гэтыя выступленні знаходзілі значную падтрымку ў каталіцкім свеце і ў тым ліку прывялі да даго, што Ватыканскае вета, выказанае ў дэкрэтах 1949 г. і 1959 г., на практыцы трактавалася па-іншаму. У пацвярджэнне гэтага міланскі часопіс “Aggiornamenti sociali” пісаў: “У агульнанацыянальным маштабе гэта мера [дэкрэты 1949 г. і 1959 г.] не прынясе наступствы юрыдычнага характару...” [23, с. 166], бо лічылася: калі яго палажэнні і могуць распаўсюджвацца на камуністаў, сацыялістаў яны не павінны тычыцца. У дачыненні да ІСП забарона насіла не агульны, дактрынальны, а абмежаваны, дысцыплінарны характар.

Усе гэтыя фактары штурхалі Ватыкан выпрацаваць новую канцэпцыю ў адносінах да прыхільнікаў ідэй сацыялізму (а пазней і да камуністаў). Гэта задача была вырашана Янам XXIII, які ў энцыкліках “Mater et magistra” і “Pacem in terris” зрабіў канчатковы паварот у бок супрацоўніцтва з левымі партыямі.

Такім чынам, вучэнне Пія XII адносна сацыялізму і камунізму шмат у чым стала працягам палажэнняў яго папярэднікаў – Пія VII, Льва XII, Рыгора XVI, Льва XIII і Пія XI. А афіцыйная пазіцыя Ватыкана да левых партый і рухаў на працягу яго пантыфікату заставалася варожай, перашкаджаючы ў пасляваенны перыяд дыялогу сацыялістаў і камуністаў з Хрысціянска-дэмакратычнай партыяй і не прыносячы стабільнасці палітычнаму жыццю Італіі. Аднак у каталіцкай царкве існавалі плыні, якія не адрозніваліся крайнім антыкамунізмам і антысацыялізмам. Менавіта яны садзейнічалі паслабленню адмоўнага стаўлення да левых і паскорылі змены ў сацыяльнай дактрыне каталіцызму, якія адбыліся ў часы пантыфікату Яна XXIII.

**Спіс асноўных крыніц**

1. Pio XI Quadragesimo anno / Pio XII // La Santa Sede [Resurso electronico]. – Vaticano, 1931. – Modo de accesso: http://www.vatican.va/holy_father/pius_xi/ encyclicals/documents/hf_p-xi_enc_19310515_quadragesimo-anno_it.html – Termino de accesso: 05.12.2014.

2. Pio XI Divini redemptoris / Pio XI // La Santa Sede [Resurso electronico]. – Vaticano, 1937. – Modo de accesso: http://www.vatican.va/holy_father/pius_xi/_encyclicals/ documents/hf_p-xi_enc_19031937_divini-redemptoris_en.html. – Termino de accesso: 08.10.2014.

3. Пий XII В человеческом роде. О некоторых ложных мнениях, угрожающих подрывом основ католического учения. 12 августа 1950 г. / Пий XII // Сайт Пия XII [Электронный ресурс]. – Ватикан, 1950. – Режим доступа : http://piusxii.ru/?p=365. – Дата доступа : 07.11.2014.

4. Пий XII Сияющая корона. О провозглашении Года Марии в память о столетии со дня определения догмата о Непорочном Зачатии. 8 сентября 1953 г. / Пий XII //

Сайт Пия XII [Электронный ресурс]. – Ватикан, 1953. – Режим доступа : http://piusxii.ru/?p=345. – Время доступа: 21.01.2012.

5. Roche, G. Pie XII devant l'Historie / G. Roche, P. Saint-Germain. – Paris : R. Laffont, 1972. – 533 p.

6. Ковальский, Н.А. Католицизм и международные отношения / Н.А. Ковальский, И.М. Иванова. – М. : Международные отношения, 1989. – 268 с.

7. Casula, C.F. Cattolici-comunisti e sinistra cristiana (1938–1945) / C.F. Casula. – Bologna : Il Mulino, 1976. – 338 p.

8. Moglia, P. Il Regime Fascista. Il giornale proprietà di Roberto Farinacci / P. Moglia // L`archivio. I documenti della storia [Resurso electronico]. – Modo de accesso: http://www.larchivio.org/xoom/paolomoglia.htm. – Termino de accesso : 12.04.2010.

9. Шаронов, М.С. Коммунисты и католики в Италии. Из истории диалога (1921–1956) / М.С. Шаронов. – М. : Наука, 1973. – 359 с.

10. Lombardi, L. Uno mano tesa, minacciosa: a proposito del liscorso Togliatti / L. Lombardi // La Civiltà Cattolica. – Q. 2277. – 1945. – 5 maggio. – P. 30–43.

11. Lombardi, L. L`ora presente e l`Italia / L. Lombardi // La Civiltà Cattolica. – Q. 2317. – 1947. – 4 gennaio. – P. 4–8.

12. Гергей, Е. История папства / Е. Гергей. – М. : Республика, 1996. – 463 с.

13. Il messaggio all`Assemblea dell`Azione Cattolica Bolognese // L`Avvenire d`Italia. – 1955. – 20 novembre. – P. 6.

14. Deplorazione choisando il discorso di Pio XII agli Amministratori Cristiani // L`Osservatore Romano. – 1955. – 24 luglio. – P. 4.

15. Lettera di Mons. Gilla Gremigni, Arcivescovo di Novara // Azione. –1961. – № 12. – P. 39.

16. Messineo, A. L'illusione della coesistenza / A. Messineo // La Civiltà Cattolica. – Q. 2523. – 1955. – 6 agosto. – P. 32–44.

17. Великович, Л.Н. Церковь и социальные проблемы современности / Л.Н. Великович. – М. : Наука, 1959. – 219 с.

18. Gliozzo, G. Il commento al comunicato della Commissione Episcopale Italiana / G. Gliozzo // La Civiltà Cattolica. – Q. 2592. – 1958. – 21 giugno. – P. 7–13.

19. Torre, G. D. Fatalità della guerra / G. D. Torra // L`Osservatore Romano. – 1947. – 14 giugno. – P. 1–3.

20. Torre, G. D. La via della guerra e il piano Marshall / G. D. Torra // L`Osservatore Romano. – 1947. – 26 giugno. – P. 4–7.

21. Brucculeri, A. La grande occusione / A. Bucculeri // La Civiltà Cattolica. – Q. 2468. – 1953. – 18 aprile. – P. 31-43.

22. Bedeschi, L. Obbedientissimo in Cristo. Lettere di don Primo Mazzolari al suo vescovo 1917–1959 / L. Bedeschi. – Milano : Mondadori, 1974. – 199 p.

23. Маджистер, С. Политика Ватикана и Италия 1943–1978 / С. Маджистер. – М. : Прогресс, 1982. – 254 с.

*The article examines the attitude of the Catholic social doctrine to socialism and communism during Church career of Pius XII (1939–1958). The article analyzes the problem of the attitude of the Pope, catalytic theologians and philosophers to the left ideology and left-wing parties (for example, in Italy). This analysis helps to understand the social doctrine of the Catholic Church during this period.*